Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры:


1. Рыжанкоў, І. М. Становішча беларускага сялянства напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі / І. М. Рыжанкоў // Труды БГТУ. – 2012. – № 5. История, философия, филология. – С. 38 – 40.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Фонд 640. Воп. 2. Спр. 36. А. 85 адв.
3. НАРБ. Фонд 640. Воп. 2. Спр. 37. А. 7.
4. НАРБ. Фонд 640. Воп. 1. Спр. 7. А. 1.
5. НАРБ. Фонд 622. Воп. 1. Спр. 9. А. 83.


## ДАКУМЕНТЫ ВАЕННЫХ КАМІСАРЫЯТАЎ З ФОНДАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ


К. Р. Карпекін, галоўны захавальнік фондаў;
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці


У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца дакументы, якія ўяўляюць цікавасць для вывучэння заключнага этапа Першай сусветнай вайны (1917 – 1918 гг.). У прыватнасці, гэта тычыцца матэрыялаў, якія ўтварыліся ў выніку дзейнасці ваенных камісарыятаў, якія функцыянавалі на неакупаванай германскімі войскамі ўсходняй частцы Віцебскай губерні. За азначаны прамежак часу архіўныя крыніцы ўтрымліваюцца ў фондзе Віцебскага губернскага, 4 павятовых і 17 валасных ваенкаматаў, у якіх справы за 1917 – 1918 гг. складаюць ад 1,7 % да 50 % ад агульнай колькасці адзінак захоўвання ў фондзе. Такія нераўнамерныя паказчыкі звязаны з дрэннай ступенню захаванасці дакументаў па некаторых фондах і рознай інтэнсіўнасцю вядзення справаводства ўстановамі. Найбольш тыповымі дакументамі, якія могуць быць выкарыстаны для даследавання згаданай тэматыкі, з’яўляюцца загады галоўнакамандуючага штабам Заходняй Арміі, загады ваенных камісараў, справаздачы і інфармацыі пра стан вайсковых частак, навучанне навабранцаў, агітацыйную працу сярод ваеннаслужачых, звесткі і перапіска пра ажыццяўленне мабілізацый і рэквізіцый, матэрыяльнае забеспячэнне арміі, барацьбу з дэзерцірствам, апытальныя лісты ваеннапалонных, спісы вайскоўцаў, мабілізаваных, былых афіцэраў царскай арміі, жыхароў валасцей, анкеты супрацоўнікаў ваенкаматаў, ведамасці на выплату заробку.

Першая сусветная вайна стала адной з тых значных геапалітычных падзей, якія абумоўліваюць пачатак новых гістарычных эпох. Барацьба найбольш магутных дзяржаў за падзел сфер уплыву карэнным чынам змяніла накірункі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця грамадства, закранула лёсы мільёнаў чалавек, паўплывала на іх светапогляд.

Аб’ектыўнае асэнсаванне любых гістарычных працэсаў патрабуе вывучэння крыніц. Вядома, што найбольшая частка дакументаў па гісторыі Першай сусветнай вайны захоўваецца ў гістарычных архівах. Тым не менш, у іншых дзяржаўных архіўных установах таксама маюцца пэўныя крыніцы па згаданай праблематыцы.

Мэта дадзенага артыкула – пранаалізаваць дакументы ваенных камісарыятаў з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, як крыніцы па гісторыі Першай сусветнай вайны.

Задачы даследавання: 1) акрэсліць кола фондаў, патрэбных для даследавання, 2) вывучыць інфармацыйны патэнцыял вывучаемых крыніц.

У архіве захоўваюцца фонды Віцебскага губернскага, павятовых і валасных ваенкаматаў.

Найбольш тыповымі дакументамі, якія ўтрымліваюцца ў складзе фонда Віцебскага губернскага ваенкамата (фонд № 1582), з’яўляюцца загады галоўнакамандуючага штабам Заходняй Арміі, загады ваеннага камісара, справаздачы пра стан вайсковых частак, звесткі і перапіска пра ажыццяўленне мабілізацый і рэквізіцый, матэрыяльнае забеспячэнне арміі, барацьбу з дэзерцірствам, спісы вайскоўцаў, анкеты супрацоўнікаў ваенкамата. Агульны аб’ем дадзенага фонда складае 1189 адзінак захоўвання, у 179 (15 %) з іх маюцца дакументы за 1918 г.

Што тычыцца матэрыялаў, якія ўтварыліся ў выніку дзейнасці павятовых ваенкаматаў, то ў першую чаргу варта звярнуць увагу на такія дакументы, як загады ваенных камісараў, справаздачы і інфармацыі пра навучанне навабранцаў, агітацыйную працу сярод ваеннаслужачых, перапіску па мабілізацыі чырвонаармейцаў, матэрыяльным забеспячэнні вайсковых частак, спісы мабілізаваных, ваеннапалонных, былых афіцэраў царскай арміі, ведамасці на выплату заробку супрацоўнікам ваенкамата. У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца фонды 4 павятовых ваенкаматаў (гл. табліцу 1).

Табліца 1

Дакументы павятовых ваенкаматаў у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці

| Назва ваенкамата | № фонда | Агульная колькасць спраў у фондзе | Колькасць спраў за 1917 – 1918 гг. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | абсалютны лік | % ад агульнай колькасці |
| Бачэйкаўскі | 1680 | 1509 | 101 | 6,7 |
| Віцебскі | 1591 | 1098 | 174 | 15,8 |
| Гарадоцкі | 1592 | 791 | 57 | 7,2 |
| Суражскі | 1681 | 302 | 18 | 6 |

Акрамя таго на неакупаванай германскімі войскамі частцы Віцебскай губерні дзейнічалі валасныя ваенкаматы. У цяперашні час у Дзяржаўным архіве

Віцебскай вобласці налічваецца 29 фондаў устаноў такога кшталту, цікавасць у вывучэнні гісторыі Першай сусветнай вайны могуць уяўляць 17 з іх (гл. табліцу 2).

Табліца 2

Дакументы валасных ваенкаматаў у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці

| Назва ваенкамата | № фонда | Агульная колькасць спраў у фондзе | Колькасць спраў за 1917 – 1918 гг. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | абсалютны лік | % ад агульнай колькасці |
| Астровенскі | 1711 | 59 | 1 | 1,7 |
| Бяскатаўскі | 1684 | 38 | 6 | 15,8 |
| Вярхоўскі | 1685 | 101 | 13 | 12,9 |
| Віраўлянскі | 1686 | 4 | 2 | 50 |
| Вымнянскі | 1689 | 59 | 21 | 35,6 |
| Вышадскі | 1690 | 59 | 4 | 6,8 |
| Горкаўскі | 1691 | 67 | 12 | 17,9 |
| Каралёўскі | 1698 | 30 | 6 | 20 |
| Мішневіцкі | 1708 | 52 | 11 | 21,2 |
| Обальскі | 1710 | 41 | 10 | 24,4 |
| Старасельскі | 1720 | 84 | 7 | 8,3 |
| Сялюцкі | 1715 | 49 | 13 | 26,5 |
| Ульянавіцкі | 1723 | 58 | 10 | 17,2 |
| Халамерскі | 1724 | 63 | 4 | 6,3 |
| Храпавіцкі | 1725 | 65 | 7 | 10,7 |
| Шчарбінскі | 1727 | 42 | 1 | 2,4 |
| Янавіцкі | 1728 | 4 | 1 | 25 |

У справах пералічаных вышэй фондаў захоўваюцца інструкцыі павятовых ваенкаматаў, загады ваенных камісараў, інфармацыі пра навучанне ваеннай справе, звесткі пра афіцэраў царскай арміі, справы па ўліку вайсковага рыштунку, перапіска пра ўлік ваеннаабавязаных, зброі, спісы жыхароў валасцей, ведамасці на выплату заробку супрацоўнікам ваенкаматаў.

З прыведзеных вышэй звестак бачна, што ў розных фондах доля спраў за 1917 – 1918 гг. вагаецца ад 1,7 % да 50 %, што абумоўлена як рознай ступенню захаванасці дакументаў у цэлым, так і інтэнсіўнасцю вядзення справаводства. Нельга не ўлічваць і той факт, што перыяды дзейнасці ваенкаматаў розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак таксама былі рознымі. Пераважная большасць з іх была ўтворана ў канцы 1917 – 1918 гг. (першапачаткова як ваенныя аддзелы Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў) і ліквідоўваліся на працягу 1922 – 1924 гг. [1, с. 117 – 118].

У згаданых вышэй відах дакументаў маецца наступная інфармацыя:

- асноўная маса загадаў прысвечана назначэнню пэўных асоб на пасады, падтрыманню вайсковай дысцыпліны, адпраўцы ў камандзіроўкі, размеркаванні грашовых сродкаў і г.д. [2];
- структура справаздач, інфармацый і дакладаў пра дзейнасць ваенкаматаў, як правіла, адпавядае структуры дадзеных устаноў: у дакументах прыведзены звесткі пра дзейнасць агульнага, уліковага, агітацыйна-вярбовачнага аддзелаў, а таксама аддзелаў фарміравання і навучання, забеспячэння [3; 6];
- звесткі пра ваеннаслужачых былой царскай арміі маглі афармляцца альбо ў выглядзе спіса на адвароце суправаджальнага ліста (як правіла, змяшчаў інфармацыю толькі пра поўнае імя асобы і яго месцажыхарства), альбо ўносіцца ў адмыслова распрацаваныя рэгістрацыйныя карткі. Апошнія прадугледжвалі ўнясенне звестак пра імя, дату і месца нараджэння, назву і час заканчэння ваеннай навучальнай установы, абставіны службы (тэрмін паступлення, звесткі пра вайсковыя часткі, удзел у баявых кампаніях, наяўнасць раненняў), стан здароўя, палітычныя погляды [7];
- пашпарты і пашпартныя кніжкі, выдадзеныя валаснымі старшынямі жыхарам воласці, у тым ліку асобам прызыўнога ўзросту, уяўляюць сабой бланкі, выраблены па пэўнаму ўзору. Дзякуючы ім можна атрымаць звесткі пра поўнае імя і месцажыхарства чалавека, яго веравызнанне, узрост, род заняткаў, сямейнае становішча (імёны членаў сям'і), адносіны да вайсковай службы, знешні выгляд (рост, колер валасоў). Асаблівасцю дадзеных матэрыялаў з'яўляецца тое, што яны датуюцца 1910-мі гг. Падобнымі да іх, але менш змястоўнымі з'яўляюцца пасведчанні, выдадзеныя ў 1918 г. старшынямі валасных выканкамаў [8];
- у імянных спісах ваеннаслужачых знайшлі адлюстраванне наступныя звесткі: імя, месца пражывання (часам толькі павет), род войскаў, атрыманае вайсковае званне. Зрэдку ў спісах таксама пазначаўся ўзрост асобы і памер атрымліваемага жалавання [4];
- апытальныя лісты вайскоўцаў, якія вярнуліся з германскага палону, нягледзячы на тое, што яны складзены ў 1919 – 1922 гг., таксама могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні падзей Першай сусветнай вайны. У дадзеных дакументах указаны імёны, узрост, званні асоб, назвы вайсковых частак, дзе яны праходзілі службу, тэрмін знаходжання ў палоне, даты прыбыцця на размеркавальныя пункты пасля вызвалення [5].

Такім чынам, у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца фонды губернскага, павятовых і валасных ваенных камісарыятаў, якія могуць быць выкарыстаны для вывучэння заключнага этапа Першай сусветнай вайны. Найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца распарадчыя, справаздачныя і ўліковыя дакументы, у якіх адлюстраваны дзейнасць устаноў і прадпрыемстваў ва ўмовах ваеннага часу, колькасны склад вайсковых частак і іх матэрыяльны стан, сацыяльны склад насельніцтва.

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры:

1. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917 – 2006 / сост. Т. В. Буевич, Ю. С. Петухов. – Минск : Медисонт, 2011. – 936 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1582. – Воп. 1. – Спр. 8.
3. ДАВВ. – Ф. 1582. – Воп. 1. – Спр. 40.
4. ДАВВ. – Ф. 1591. – Воп. 1. – Спр. 237.
5. ДАВВ. – Ф. 1591. – Воп. 1. – Спр. 722.
6. ДАВВ. – Ф. 1592. – Воп. 3. – Спр. 3.
7. ДАВВ. – Ф. 1708. – Воп. 1. – Спр. 7.
8. ДАВВ. – Ф. 1711. – Воп. 1. – Спр. 1.

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНСКОЙ КОЛЛЕГИИ ПО ДЕЛАМ ПЛЕННЫХ И БЕЖЕНЦЕВ В 1918 ГОДУ

Т. П. Иванова, доцент;
Витебский филиал Международного университета «МИТСО»

В условиях продолжавшейся Первой мировой войны 23 апреля 1918 г. подписан Декрет СНК РСФСР о создании Центральной коллегии по делам пленных и беженцев (Центрпленбеж). Названная коллегия в мае 1918 г. передана в ведение Наркомата внутренних дел РСФСР. 29 мая 1918 г. Коллегия по делам пленных и беженцев образована в Западной области РСФСР, филиалы коллегии действовали в Витебске, Полоцке, Орше, Себеже, Невеле, других городах.

Структура Витебской губернской коллегии по делам пленных и беженцев (губпленбежа) была следующей: административный отдел, отдел пленных, отдел беженцев, техническая часть, реэвакуационный отдел, культурно-просветительный отдел, справочно-информационное бюро.

В мае–июле 1918 года в Витебске и на контрольно-пропускных пунктах Витебской губернии – в Себеже, Полоте, Горянах, Невеле – скопилось значительное количество беженцев. Согласно регламенту заведующий отделом пленных Витебского губпленбежа согласовывал с Главным германским командованием в Полоцке условия пропуска и приема пленных и беженцев. Но немецкие оккупационные власти, интересуясь преимущественно немецкими и австрийскими пленными, беженцев пропускали по своему усмотрению. В концу июля 1918 года количество пропущенных немецкими оккупационными властями беженцев несколько увеличилось, появились предпосылки для установления более-менее равномерного пропуска беженцев. Но отдельные случаи вспышки холеры в Витебской губернии, обнаруженные у беженцев, вновь осложнили отношения. Границу в пропускном пункте Полота немцы